УДК 94(476)«653/654»:930.2«19/20»+94(476)(092)Лойка

# ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ ПЕРИОДА СРЕДНЕВЕКОВЬЯ И РАННЕГО НОВОГО ВРЕМЕНИ В ИССЛЕДОВАНИЯХ ПАВЛА ЛОЙКО (1958–2010)

***В. А. ПОДОЛИНСКИЙ***[1)]***, Е. Г. ДЕНИСОВА***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Анализируется вклад П. О. Лойко в изучение истории Беларуси периода Средневековья и раннего Нового времени. Отмечено, что известный белорусский историк оставил после себя чрезвычайно богатое и разнообразное научное наследие, однако до сих пор его роль в развитии белорусской историографии не получила серьезного осмысления. Определены основные направления научных исследований П. О. Лойко: аграрная и политическая история, социальные отношения. Указано, что анализ историографического наследия П. О. Лойко важен для определения перспективных путей дальнейшего изучения социально-политической истории Беларуси XV–XVIII вв.

***Ключевые слова:*** Павел Лойко; историография; Великое княжество Литовское; шляхта; крестьянство; социальные отношения; институты государственной власти.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ СЯРЭДНЯВЕЧЧА І РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ ПАЎЛА ЛОЙКІ (1958–2010)

***У. А. ПАДАЛІНСКІ***[1*]***, А. Р. ДЗЯНІСАВА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Аналізуецца ўнёсак П. А. Лойкі ў вывучэнне гісторыі Беларусі перыяду Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Адзначана, што вядомы беларускі гісторык пакінуў пасля сябе надзвычай багатую і разнастайную навуковую спадчыну, аднак да гэтага часу яго роля ў развіцці беларускай гістарыяграфіі не атрымала сур'ёзнага асэнсавання. Вызначаны асноўныя кірункі навуковых даследаванняў П. А. Лойкі: аграрная і палітычная гісторыя, сацыяльныя адносіны. Паказана, што аналіз гістарыяграфічнай спадчыны П. А. Лойкі важны для вызначэння перспектыўных шляхоў далейшага вывучэння сацыяльна-палітычнай гісторыі Беларусі XV–XVIII стст.

***Ключавыя словы:*** Павел Лойка; гістарыяграфія; Вялікае Княства Літоўскае; шляхта; сялянства; сацыяльныя адносіны; інстытуты дзяржаўнай улады.

**Образец цитирования:**
Падалінскі УА, Дзянісава АР. Гісторыя Беларусі перыяду Сярэднявечча і ранняга Новага часу ў даследаваннях Паўла Лойкі (1958–2010). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2018;3:110–119.

**For citation:**
Padalinski UA, Dzianisava AR. History of Mediaeval and early modern Belarus in the research of Pavel Lojka (1958–2010). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2018;3:110–119. Belarusian.

**Авторы:**
***Владимир Алексеевич Подолинский*** – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета.
***Елена Григорьевна Денисова*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета.

**Authors:**
***Uladzimir A. Padalinski***, PhD (history), docent; head of the department of Belarus history of the Ancient time and the Middle Ages, faculty of history.
*ulpadalinski1978@gmail.com*
***Alena R. Dzianisava***, PhD (history), docent; associate professor at the department of Belarus history of the Ancient time and the Middle Ages, faculty of history.
*e.g.denisova2012@gmail.com*

# HISTORY OF MEDIAEVAL AND EARLY MODERN BELARUS IN THE RESEARCH OF PAVEL LOJKA (1958–2010)

***U. A. PADALINSKI***[a]***, A. R. DZIANISAVA***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

*Corresponding author: U. A. Padalinski (ulpadalinski1978@gmail.com)*

Pavel Lojka's contribution in the study of the history of Mediaeval and Early Modern Belarus is analyzed in the article. The well-known Belarusian historian left a highly rich and diverse scientific heritage. However, his role in the development of Belarusian historiography has not yet received a serious comprehension. Main directions of P. A. Lojka's scientific research are identified: agrarian and political history, social relations. An analysis of his historiographic heritage is important for determining promising ways of further studying the social and political Belarus history of the XV–XVIII centuries.

***Key words:*** Pavel Lojka; historiography; the Grand Duchy of Lithuania; nobility; peasantry; social relations; government institutions.

У ліпені 2018 г. спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння таленавітага навукоўца, выдатнага выкладчыка і цудоўнага чалавека Паўла Алегавіча Лойкі. На вялікі жаль, восем гадоў таму яго жыццё так заўчасна спынілася. Гэта трагічная падзея стала балючым ударам не толькі для родных і блізкіх Паўла Алегавіча, але і для ўсёй беларускай гістарычнай навукі. Не будзе перабольшваннем сказаць, што П. А. Лойка пакінуў пасля сябе надзвычай багатую і разнастайную навуковую спадчыну, якая да гэтага часу яшчэ не атрымала свайго ўсебаковага асэнсавання. Яшчэ на мяжы XX–XXI стст. у шэрагу энцыклапедычных і даведачных выданняў публікавалася кароткая біяграфія даследчыка [1–4]. Пасля сыходу П. А. Лойкі з жыцця яго вучні і сябры прысвяцілі яму некалькі артыкулаў [5; 6]. Гісторык Уладзімір Сосна, блізкі сябар і калега П. А. Лойкі, зрабіў агляд яго работ, прысвечаных гісторыі беларускага сялянства і шляхты [7]. Аднак гэтага, відавочна, недастаткова для ацэнкі ўнёску выдатнага беларускага гісторыка ў вывучэнне айчыннай мінуўшчыны. Адпаведна, у гэтым артыкуле мы ставім мэту разгледзець прафесійны шлях П. А. Лойкі і прааналізаваць галоўныя кірункі яго навуковых даследаванняў.

Павел Алегавіч Лойка нарадзіўся 12 ліпеня 1958 г. у г. Слоніме Гродзенскай вобласці. Яго бацька Алег Антонавіч, вядомы беларускі паэт, літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, і маці Лідзія Іванаўна выхоўвалі дзяцей у атмасферы любві і павагі да сваіх продкаў, Бацькаўшчыны, яе мінулага. Таму не дзіўна, што пасля заканчэння ў 1975 г. сярэдняй школы № 60 г. Мінска Павел Алегавіч паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У студэнцкія гады Павел Лойка свядома абраў для даследавання гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і пад кіраўніцтвам Валянціны Анатольеўны Цяпловай выконваў адпаведныя курсавыя і дыпломны праекты. У 1980 г. ён атрымаў дыплом з адзнакай аб вышэйшай адукацыі з кваліфікацыяй «Гісторык. Выкладчык гісторыі і грамадазнаўства» і працягнуў навучанне ў аспірантуры Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР. Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі ў 1984 г. П. А. Лойку была прысвоена вучоная ступень кандыдата гістарычных навук, а ў 2000 г. – вучонае званне дацэнта[1]. З 1983 г. Павел Алегавіч працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР, дзе займаў пасады малодшага навуковага супрацоўніка, навуковага супрацоўніка, старшага навуковага супрацоўніка. На працягу 1990–2001 гг. П. А. Лойка ўзначальваў аддзел гісторыі Беларусі XIII–XVIII стст. Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 1994–2006 гг. быў загадчыкам кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а затым дацэнтам названай кафедры[2].

Свой даследчы шлях П. А. Лойка распачаў з вывучэння беларускага сялянства. Дысертацыйнае даследаванне Паўла Алегавіча, прысвечанае феадальнай рэнце ў прыватнаўласніцкіх уладаннях Беларусі другой паловы XVI – XVIII ст., было створана пад навуковым кіраўніцтвам Васіля Іванавіча Мялешкі – аднаго з мэтраў беларускай школы сацыяльна-эканамічнай гісторыі. На аснове дысертацыі з'явілася манаграфія [8], у якой П. А. Лойка падрабязна разгледзеў фарміраванне сістэмы рэнтных адносін на беларускіх землях, вызначыў прычыны і дынаміку змен яе форм, памераў і структуры ў розныя гістарычныя перыяды, прычым з улікам рэгіянальных асаблівасцей. Упершыню ў гістарыяграфіі ставілася задача вывучыць эвалюцыю феадальнай рэнты ва ўладаннях дробнай і сярэдняй шляхты, якая складала абсалютную большасць землеўладальнікаў на землях Беларусі [8, с. 5–6]. Была зроблена выснова аб павелічэнні менавіта адработачных форм рэнты. Ужо ў гэтым даследаванні праявілася вялікая

[1]Аддз. арх. работы, уліку і выкарыстання дак. БДУ. Ф. 205. Воп. 10. Спр. 1112. Асабістая справа Лойкі П. А. 1992–2010 гг. Арк. 9–10.

[2]Там жа. Арк. 1–2, 4–5, 7–8.

працаздольнасць Паўла Алегавіча, карпатлівасць у зборы дакументальных матэрыялаў, уменне грунтоўна апрацоўваць і аналізаваць розныя віды крыніц. Такі падыход дазволіў навукоўцу сабраць багаты крыніцавы матэрыял, выкарыстаць статыстычны метад пры яго аналізе і зрабіць свае высновы пераканаўчымі і нагляднымі [7, с. 316–318; 8, с. 99–111]. Такім чынам, малады даследчык зрабіў важкі ўнёсак у вывучэнне гісторыі феадальных адносін, традыцыі якога ў 1970–80-я гг. былі ў Беларусі вельмі моцнымі. Напрацоўкі Паўла Алегавіча ляглі ў аснову першага тома спецыяльнага выдання, прысвечанага гісторыі беларускага сялянства ад старажытных часоў да сярэдзіны XIX ст. [9]. У дадзенай рабоце П. А. Лойка ў суаўтарстве з іншымі вядомымі даследчыкамі – В. Ф. Голубевым і У. А. Соснам – грунтоўна прааналізаваў асаблівасці развіцця феадальных павіннасцей у Беларусі як у часы Рэчы Паспалітай, так і пасля яе далучэння да Расійскай імперыі [7, с. 318; 9, с. 147–159, 193–216, 259–267, 301–309]. Асобная ўвага звярталася на промыслы і рамесныя заняткі сялян, асаблівасці іх наёмнай працы ва ўмовах разлажэння і крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы [9, с. 310–321]. У цэлым на старонках выдання была прадстаўлена яскравая карціна гаспадарчай дзейнасці беларускага селяніна да пачатку буржуазнай мадэрнізацыі ў Расійскай імперыі. Сялянскую праблематыку П. А. Лойка закранаў і ў абагульняючых выданнях па айчыннай гісторыі. У першай падобнай рабоце, напісанай у незалежнай Беларусі, даследчык падрабязна паказаў асаблівасці гаспадарчага жыцця простага земляроба ў сярэдзіне XVII – XVIII ст., пастаянны рост павіннаснага цяжару, амаль безабароннае прававое становішча сялян [10, с. 243–252]. Разам з тым, у адрозненне ад традыцый савецкай гістарыяграфіі, у якой націск рабіўся выключна на жорсткай эксплуатацыі сялянства з боку феадалаў, П. А. Лойка абсалютна справядліва падкрэсліваў, што заможнасць землеўладальніка непасрэдна залежала ад заможнасці яго падданых [10, с. 244]. Такі падыход дазваляў вывучаць гісторыю беларускага сялянства куды больш усебакова і адэкватна. У самым новым на дадзены момант шматтомным навуковым выданні «Гісторыя Беларусі» П. А. Лойка ў суаўтарстве з В. Ф. Голубевым разгледзеў становішча сялян ва ўмовах пераадолення гаспадарчага крызісу сярэдзіны XVII – першай паловы XVIII ст., прычым як у дзяржаўных, так і ў прыватных ды царкоўных уладаннях [11, с. 126–137]. Пяру П. А. Лойкі таксама належаў падраздзел, прысвечаны феадальнай гаспадарцы на беларускіх землях Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. [11, с. 170–178]. Сярод іншага ў ім сцісла былі акрэслены новыя эканамічныя з'явы, што праявіліся ў Беларусі ў той час: развіццё мясцовай перапрацоўчай прамысловасці, усё большае выкарыстанне наёмнай працы, ужыванне сучасных агратэхнічных прыёмаў, актывізацыя знешнегандлёвых сувязей.

Ужо ў пачатку навуковай дзейнасці П. А. Лойкі выявілася яшчэ адна характэрная рыса, якая вылучала яго як даследчыка. Павел Алегавіч заўсёды імкнуўся бачыць у гісторыі не толькі лічбы і даты, працэсы і з'явы, але і чалавека [5, с. 452]. Мабыць, таму яшчэ адным кірункам яго даследчай работы стала вывучэнне сацыяльных адносін на беларускіх землях у часы Рэчы Паспалітай. Працуючы з сялянскай праблематыкай, П. А. Лойка аб'ектыўна сутыкаўся з пытаннямі міжсаслоўных канфліктаў. Яшчэ ў 1986 г. пабачыў свет невялікі артыкул, у якім даследчык на аснове архіўных матэрыялаў, выяўленых у рукапісным аддзеле Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, паказаў канфлікт 1620-х гг. паміж сялянамі Горацкай воласці Аршанскага павета, што належала роду Сапегаў, і адміністрацыяй уладання [12]. У 1988 г. П. А. Лойка выступіў адным са складальнікаў першага ў айчыннай гістарычнай навуцы зборніка дакументаў, цалкам прысвечанага тэме сацыяльна-палітычнай барацьбы насельніцтва Беларусі ў перыяд феадалізму [13]. Для гэтага выдання Павел Алегавіч перакладаў дакументы з польскай на рускую мову, а таксама сумесна з В. І. Мялешкам і З. Ю. Капыскім напісаў гістарычную частку прадмовы [13, с. 5–11, 14]. І хаця зборнік рыхтаваўся пад моцным ідэалагічным уплывам, ён тым не менш з'яўляецца важнай крыніцай (утрымлівае 167 дакументаў і іх фрагментаў) для вывучэння сацыяльных адносін на беларускіх землях у XIV–XVII стст. Павел Алегавіч разам са сваім былым навуковым кіраўніком В. І. Мялешкам спрычыніўся да даследавання і пашырэння ведаў пра адно з буйнейшых сялянскіх выступленняў у гісторыі Беларусі – Крычаўскае паўстанне 1740–1744 гг. У 1992 г. аўтары выдалі кнігу, у якой разгледзелі не толькі падзеі паўстання, але і жыццёвы шлях яго кіраўніка Васіля Вашчылы [14]. Гэта работа мела навукова-папулярны характар і была разлічана на масавага чытача, аднак напісана яна была на аснове сур'ёзнага аналізу архіўных матэрыялаў з Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны ў Кіеве [7, с. 318–319]. Асоба В. Вашчылы – *сапраўднага героя народнага* – паказана аўтарамі з улікам шырокага гістарычнага кантэксту жыцця беларускай вёскі XVII–XVIII стст. Розныя сялянскія выступленні другой паловы XVII – першай паловы XVIII ст., у тым ліку Крычаўскае паўстанне 1740–1744 гг. і паўстанне на Каменшчыне (Мазырскі павет) 1750-х гг., разглядаліся П. А. Лойкам і ў абагульняючых работах па гісторыі Беларусі [10, с. 254–259; 11, с. 137–148]. У 2009 г. даследчык апублікаваў артыкул, у якім закрануў праблему міжсаслоўных адносін паміж шляхтай і сялянамі ў другой пало-

ве XVI – першай палове XVII ст. [15]. На падставе вывучэння шматлікіх дакументальных матэрыялаў аўтар адмовіўся ад разгляду шляхецка-сялянскіх узаемадачыненняў як выключна канфрантацыйных і ацэньваў іх як шматузроўневыя [15, с. 73]. Даследчык паказаў розныя аспекты адносін паміж панамі і падданымі, у тым ліку і супрацьпраўныя дзеянні з боку апошніх, падкрэсліў зацікаўленасць шляхты ў эканамічнай падтрымцы гаспадаркі сваіх сялян, прасачыў рысы тагачаснай сялянскай псіхалогіі. Асаблівы акцэнт быў зроблены на тым, што найбольш жорсткае стаўленне да сялян мелі не столькі іх непасрэдныя ўладальнікі, колькі адміністратары або арандатары маёнткаў. Дададзім таксама, што П. А. Лойка не толькі распрацоўваў тэматыку сацыяльнага пратэсту беларускага сялянства, але і прысвяціў спецыяльны навуковы артыкул узаемаадносінам шляхецкага і мяшчанскага саслоўяў на землях Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. [16]. Пры гэтым увага была нададзена як канфліктам паміж прадстаўнікамі гэтых двух саслоўяў, так і ўзаемадапаможным дачыненням шляхты і мяшчанства. Дадзеныя работы і на сёння з'яўляюцца важным падмуркам для далейшага даследавання сацыяльных канфліктаў у гісторыі Беларусі перыяду ранняга Новага часу.

Даследаванне сацыяльнай гісторыі непасрэдна паўплывала на тое, што ў кола навуковых інтарэсаў Паўла Алегавіча ўвайшлі і пытанні канфесійнай гісторыі Беларусі. Ён і М. В. Біч сталі рэдактарамі першага ў айчыннай гістарыяграфіі навуковага зборніка аб Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. [17]. Сярод аўтараў 11 артыкулаў кнігі былі вядомыя беларускія гісторыкі, філолагі і філосафы: С. Марозава, Т. Казакова, Ю. Бохан, У. Конан, Л. Іванова і інш. У выданні разгледжаны праблемы ўніяцкай царквы ад узнікнення ідэі саюза праваслаўя з каталіцтвам да рэалізацыі планаў уніі і яе скасавання. Як адзначалася ў прадмове, аўтараў кнігі аб'ядноўвала разуменне, з аднаго боку, неардынарнасці, унікальнасці такой з'явы, як унія, і, з другога боку, яе складанасці, супярэчлівасці [17, с. 3]. Павел Алегавіч лічыў, што гвалтоўнае навязванне уніі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. прывяло да раз'яднання грамадства. Разам з тым, калі да канца XVIII ст. большасць насельніцтва Беларусі вызнавала ўніяцтва, гэта царква спрыяла захаванню моўна-культурнай традыцыі беларусаў і ў пэўнай ступені стала бар'ерам супраць іх апалячвання. Важнымі якасцямі аўтарскага падыходу да распрацоўкі акрэсленай праблемы былі імкненне да ўзважанасці, аб'ектыўнасці, доказнасці, уліку разнастайных крыніц, пераадолення канфесійнай зададзенасці расійска-савецкай і польскай гістарыяграфіі і вялікая павага да мінулага свайго народа [17, с. 3]. У адным са сваіх пазнейшых артыкулаў П. А. Лойка пісаў пра талерантнае стаўленне шляхты беларускіх зямель Рэчы Паспалітай да кожнага веравызнання, яе імкненне не дапускаць у дзяржаве распальвання супрацьстаяння і варожасці ў рэлігійнай сферы [18]. Вывучэнне матэрыялаў павятовых соймікаў апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст. прывяло аўтара да высновы пра тое, што пазіцыя шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў пытаннях царкоўна-рэлігійных адносін была разважлівай і адпавядала гістарычнай рэчаіснасці [18, с. 105].

Вывучэнне сацыяльна-эканамічнай праблематыкі і асабліва сацыяльных адносін, безумоўна, падводзіла П. А. Лойку да пытання пра ролю вышэйшага саслоўя ВКЛ – шляхты – у беларускай гісторыі, а значыць і да праблематыкі грамадска-палітычнай. Аднак у савецкі час па ідэалагічных прычынах Вялікае Княства Літоўскае і тым больш Рэч Паспалітая абвяшчаліся чужымі для беларусаў, а даследаванне навукоўцамі БССР палітычнай гісторыі гэтых дзяржаў было значна абмежавана і фактычна зведзена да мінімуму. Не магло быць і гаворкі пра сур'ёзнае вывучэнне ў савецкай Беларусі шляхецкага стану, які быў «эксплуататарам народных мас» і трактаваўся выключна негатыўна. Да таго ж у ВКЛ і Рэчы Паспалітай феадалы маглі быць толькі «літоўскімі» або «польскімі», але ні ў якім разе не «беларускімі» (заўважым, праўда, што некаторыя айчынныя гісторыкі нават у той час спрабавалі выйсці за межы такой спрошчанай схемы (гл., напрыклад, [19]). Аднак працэсы дэмакратызацыі грамадскага жыцця СССР, якія распачаліся ў другой палове 1980-х гг., сутнасна паўплывалі і на развіццё гістарычнай навукі ў Беларусі. Рэзка ўзрасла цікавасць да мінуўшчыны беларускага народа, асабліва да дзяржаўна-палітычнай гісторыі нашых зямель. І адным з першых айчынных даследчыкаў, хто пачаў вывучаць палітычную гісторыю ВКЛ і Рэчы Паспалітай з беларускай перспектывы, быў менавіта Павел Алегавіч Лойка.

Да 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны Акадэмія навук БССР падрыхтавала навуковае выданне, мэтай якога было грунтоўнае адлюстраванне культурна-гістарычных умоў, у якіх жыў і дзейнічаў вялікі беларускі першадрукар і асветнік [20, с. 5]. Работа ўтрымлівала аб'ёмны раздзел «Беларусь у канцы XV – сярэдзіне XVI ст.», напісаны В. І. Мялешкам, З. Ю. Капыскім і П. А. Лойкам. Менавіта ў ім Павел Алегавіч, напэўна ўпершыню, звярнуўся да ключавых пытанняў палітычнай гісторыі Беларусі XIII–XVI стст.: утварэння Вялікага Княства Літоўскага і ролі «рускіх» княстваў у гэтым працэсе, сацыяльна-прававога становішча беларускіх зямель у складзе ВКЛ, афармлення саслоўных правоў феадалаў каталіцкага і праваслаўнага веравызнання, станаў-

лення органаў дзяржаўнай улады (паноў-рады і вальнага сойма), развіцця мясцовага кіравання і самакіравання, рэлігійнай палітыкі вялікіх князёў літоўскіх [20, с. 39–66]. Пасля атрымання ў 1991 г. Рэспублікай Беларусь суверэнітэту П. А. Лойка стаў вядучым беларускім спецыялістам у галіне палітычнай гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Ужо ў 1992 г. ён пісаў пра «магутны славянскі зачын Вялікага Княства… які прадвызначыў беларускі змест… гэтай дзяржавы» [21, с. 76]. Павел Алегавіч актыўна ўдзельнічаў у напісанні «Нарысаў гісторыі Беларусі» – першай у незалежнай Беларусі абагульняючай работы па айчыннай гісторыі. Для гэтага выдання П. А. Лойка напісаў падраздзелы «Палітычныя адносіны ў Вялікім Княстве Літоўскім» і «Палітычнае становішча. Канец Рэчы Паспалітай» (у суаўтарстве з У. П. Емяльянчыкам), якія ахоплівалі перыяд з сярэдзіны XIII да канца XVIII ст. [10, с. 114–140, 228–243]. Магчыма, гэта работа не была пазбаўлена рамантызму нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння пачатку 1990-х гг., але, на нашу думку, яна не страціла сваёй навуковай і вучэбнай актуальнасці і цяпер. На старонках выдання Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае называлася «Беларуска-Літоўскім гаспадарствам» [10, с. 116, 126], а значыць, айчынная навука трывала вярталася да вывучэння гістарычнай спадчыны гэтай дзяржавы. Акрамя таго, пераканаўча, па-навуковаму абгрунтавана даводзілася вельмі важная і прынцыповая думка пра тое, што і ВКЛ, і Рэч Паспалітая, якая акрэслівалася як федэрацыя, з’яўляліся гістарычнымі этапамі беларускай дзяржаўнасці [10, с. 132, 135, 138, 231]. Паступова вяртаўся з забыцця і ўласны палітычны народ – шляхта. Вынікі сваіх далейшых навуковых пошукаў П. А. Лойка выклаў у шматтомным абагульняючым выданні па гісторыі Беларусі [22]. Даследчык разгледзеў сістэму кіравання і прававы статус беларускіх зямель у складзе ВКЛ, унутраную палітыку вялікіх князёў літоўскіх, органы мясцовага самакіравання і саслоўнага прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага да заключэння Люблінскай уніі 1569 г. [22, с. 168–183, 380–387] Падкрэслівалася, што афармленне ў другой палове XVI ст. агульнадзяржаўнага вальнага сойма як вышэйшага ўладнага інстытута, які абмяжоўваў уладу вялікага князя, надавала палітычнаму ладу Вялікага Княства Літоўскага рысы саслоўнай манархіі [22, с. 387].

Важным дасягненнем Паўла Алегавіча ў галіне вывучэння палітычнай гісторыі Беларусі стала выданне навуковай манаграфіі [23], напісанай на падставе матэрыялаў доктарскай дысертацыі, якую ён рыхтаваў, але, на вялікі жаль, так і не паспеў абараніць. У манаграфіі гісторык выказаў свой погляд на працэс прававога афармлення шляхецкага саслоўя ВКЛ у XIV–XVI стст., яго сацыяльны, маёмасны і этнаканфесійны склад, ролю сярэдняй і дробнай шляхты ў дзяржаўным жыцці [7, с. 321; 23, с. 8–27]. Была разгледжана ступень сацыяльнай актыўнасці шляхты беларускіх зямель у кантэксце развіцця парламенцкай сістэмы ВКЛ у другой палове XVI – пачатку XVII ст. Асноўная ўвага ў манаграфіі надавалася вывучэнню пазіцыі павятовага шляхецтва па шырокім коле пытанняў унутранай і знешняй палітыкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай [7, с. 321–322; 23, с. 31–80]. На думку аўтара, на сацыяльную актыўнасць шляхты ВКЛ уплывалі тры галоўныя фактары: эканамічнае развіццё таго ці іншага рэгіёна, унутрыпалітычная і знешнепалітычная сітуацыя [23, с. 34]. Павел Алегавіч таксама зрабіў спробу выявіць сістэму каштоўнасцей, характэрную для грамадска-палітычнай свядомасці шляхты беларускіх зямель у той гістарычны перыяд [7, с. 322; 23, с. 86–93]. У прыватнасці, быў праведзены семантычны аналіз паняцця «Айчына» ва ўспрыманні шляхты беларускіх зямель канца XVI – першай трэці XVII ст. [23, с. 87–88]. Дадзенае даследаванне грунтавалася на аналізе вялікай колькасці архіўных матэрыялаў, пераважна з Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве, звязаных перадусім з працай павятовых соймікаў. Шмат якія з гэтых дакументаў уводзіліся ў навуковы зварот упершыню. Манаграфія П. А. Лойкі стала ў пэўнай ступені этапнай з’явай у айчыннай гістарыяграфіі Вялікага Княства Літоўскага. З аднаго боку, яна падсумавала вынікі папярэдніх напрацовак беларускіх даследчыкаў па гісторыі шляхецкага саслоўя. З другога боку, у ёй былі акрэслены важнейшыя кірункі далейшага вывучэння палітычнай пазіцыі шляхты па разнастайных пытаннях грамадскага жыцця ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

Некаторыя палажэнні, выказаныя ў згаданай манаграфіі, даследчык пазней развіў у шэрагу артыкулаў [24–28]. Асобны матэрыял быў прысвечаны ўзаемаадносінам ВКЛ і Польшчы ў складзе Рэчы Паспалітай на мяжы XVI і XVII стст. [29]. Побач з разглядам канфліктаў, якія час ад часу ўзнікалі паміж імі (напрыклад, па пытаннях прыналежнасці ўкраінскіх зямель і Падляшша або забароны палякам займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ), былі зроблены важныя назіранні аб характары суіснавання двух суб’ектаў федэрацыі. Так, П. А. Лойка сцвярджаў, што захады велікакняжацкай шляхты па карэкціроўцы ўмоў Люблінскага акта 1569 г. і ўмацаванні свайго становішча ў Рэчы Паспалітай нельга лічыць сепаратызмам, паколькі супраць самой уніі шляхта не выступала. Наадварот, у пачатку XVII ст. толькі ўзмацніліся працэсы інтэграцыі Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай [29, с. 84, 90–91]. Цікавасць таксама выклікае артыкул, у якім П. А. Лойка аналізаваў погляды славутага дзеяча ВКЛ Льва Сапегі на прынцыпы функцыянавання дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай [30].

У рабоце была закранута куды больш шырокая праблематыка, а менавіта палітычныя ідэалы шляхты Вялікага Княства Літоўскага: захаванне грамадзянскай згоды і міру ўнутры краіны, строгае выкананне законаў усімі органамі дзяржаўнай улады. Погляды ўласна «вялікага дзяржаўніка» адлюстроўваліся на аснове цікавага архіўнага дакумента, знойдзенага ў Варшаве, які П. А. Лойка называў палемічным творам, а яго аўтарства прыпісваў якраз Л. Сапегу [30, с. 11–12]. Аднак варта ўдакладніць, што гэты дакумент па форме і змесце з'яўляецца каралеўскай інструкцыяй на павятовыя соймікі ВКЛ перад вальным соймам Рэчы Паспалітай 1590–1591 гг.[3] І ў ім у першую чаргу выказана пазіцыя каралеўскага двара па найбольш актуальных на той момант пытаннях унутранай і знешняй палітыкі дзяржавы. Пад інструкцыяй, напісанай ад імя караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы, сапраўды стаіць подпіс канцлера ВКЛ Л. Сапегі, што можа сведчыць пра яго непасрэдны ўдзел у канчатковым рэдагаванні тэксту (не выключана, што і ў складанні дакумента). Цяжка меркаваць, наколькі там былі адлюстраваны асабістыя погляды Льва Сапегі, а ў якой ступені выказаны агульныя настроі ў асяроддзі ўладнай эліты Рэчы Паспалітай. Тым не менш гэты дакумент, які, па сутнасці, быў зваротам да ўсяго шляхецкага стану Вялікага Княства Літоўскага, з'яўляецца насамрэч вельмі каштоўным помнікам грамадскай думкі Беларусі і Літвы канца XVI ст. Выказаныя ў ім думкі яскрава паказваюць сістэму каштоўнасцей і грамадска-палітычную свядомасць шляхты ВКЛ, яе патрэбы і настроі, адлюстроўваюць стаўленне да ўладных інстытутаў і палітычных падзей, ментальныя ўяўленні і гістарычную памяць.

Вынікі навукова-даследчай працы Паўла Алегавіча непасрэдным чынам уплывалі на яго выкладчыцкую дзейнасць. У 1994 г. П. А. Лойка ўзначаліў кафедру гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ. Працуючы на кафедры, Павел Алегавіч распрацаваў і выкладаў лекцыйны курс «Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да сярэдзіны XV ст.». Яго навуковыя напрацоўкі непасрэдна выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы спецыяльных курсаў «Уплыў войнаў і сацыяльна-палітычных канфліктаў на этнаканфесійнае развіццё беларусаў у XIV–XVIII стст.», «Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага сярэдзіны XIII – першай паловы XV ст.», «Саслоўная структура беларускага грамадства XVI – першай паловы XVII ст.»[4]. Таксама П. А. Лойка праявіў сябе як выдатны кіраўнік навуковых работ студэнтаў і аспірантаў. Яго рысай была павага да даследчых зацікаўленасцей сваіх вучняў. Ён ніколі не навязваў уласны пункт гледжання на выбар тэмы даследавання, інтэрпрэтацыю тых ці іншых падзей або аўтарскія высновы, але заўсёды быў гатовы дапамагчы ў пошуку крыніц і спецыяльнай літаратуры, адкрыта дзяліўся вынікамі сваёй работы ў замежных архівах, трапна і далікатна ўказваў вучням на недахопы ў іх тэкстах. За гады свайго жыцця П. А. Лойка падрыхтаваў дзесяць кандыдатаў гістарычных навук [6, с. 38–39; 7, с. 323]. Дысертацыйныя даследаванні вучняў Паўла Алегавіча былі прысвечаны разнастайным аспектам мінулага Беларусі XIII–XVIII стст.: палітычнай гісторыі (Г. Прыбытка [31], У. Падалінскі [32], В. Цішчанка [33], М. Шніп [34]), развіццю асобных рэгіёнаў ВКЛ (Г. Ластоўскі [35], В. Воранін [36]), духоўнаму жыццю (А. Самусік [37], А. Скеп'ян [38]), некаторым катэгорыям сялянства (А. Доўнар [39]) і крыніцазнаўству (В. Галубовіч [40]). Заўважым таксама, што пад навуковым кіраўніцтвам П. А. Лойкі пачынала працаваць над кандыдацкай дысертацыяй, прысвечанай месцу Вялікага Княства Літоўскага ў знешняй палітыцы Рэчы Паспалітай пачатку XVII ст., А. Дземідовіч, але абараняла сваю работу яна ўжо пасля сыходу з жыцця Паўла Алегавіча [41].

